Источник: "Звязда" - 2018-12-07

## З любоўю да братоў меншых

# Зімовы «санаторый» для кажаноў

**У Мінску адкрыўся рэабілітацыйны цэнтр для кажаноў. Яго стварэнне ініцыявалі Мінскае гарадское аддзяленне грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) і НПЦ па біярэсурсах.**

Вядома, што некаторыя рукакрылыя застаюцца зімаваць у Беларусі і ўпадаюць у спячку. Рытм сэрца ў іх запавольваецца, а тэмпература паніжаецца. У гарадах кажаны могуць зімаваць на балконах, у пад'ездах і часта, патурбаваныя чалавекам або ад перападу тэмператур, прачынаюцца. Гэта можа прывесці да іх гібелі, бо, каб прачнуцца, кажаны трацяць амаль усю назапашаную энергію. Аднавіць яе няма чым: насякомых для харчавання ўзімку яны не знойдуць. Каб выратаваць рукакрылых, трэба знайсці для іх спальнае месца і ўвесці ў спячку.



«Аптымальная тэмпература для зімоўкі кажаноў — ад +4 да +8 градусаў. Гэта звычайная тэмпература ў нашым халадзільніку», — кажа **хіраптэролаг цэнтра Аляксей ШПАК, супрацоўнік НПЦ па біярэсурсах**.

У АПБ запэўніваюць: усе перададзеныя ў цэнтр «Кажанаполіс» (поліс (грэч.) — горад) рукакрылыя будуць правярацца, узважвацца, каб высветліць іх стан здароўя, і змяшчацца ў лядоўню на зімоўку. Калі ў звярка вага паніжаная — яго давядзецца падкарміць штучна выведзенымі насякомымі, інакш ён не дажыве да вясны. Вясной усіх выпусцяць у дзікую прыроду.

Ратаваць кажаноў важна, бо рукакрылыя размнажаюцца марудна (самкі могуць нарадзіць толькі аднаго-двух кажанятак у год). А гэта значыць, што на аднаўленне папуляцый многіх відаў патрэбны дзесяцігоддзі. Дарэчы, з 19 відаў кажаноў у Беларусі восем уключаны ў нацыянальную Чырвоную кнігу.

Цэнтры рэабілітацыі рукакрылых існуюць у многіх краінах, але ў Беларусі такі цэнтр з'явіўся ўпершыню. «Кажанаполіс» нарадзіўся з ініцыятывы Мінскага гарадскога аддзялення грамадскай арганізацыі АПБ і Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах. Дзякуючы краўдфандынгавай платформе «МаеСэнс» праект сабраў патрэбную суму для закупкі халадзільніка для цэнтра і іншага абсталявання. Трэці партнёр ініцыятывы — Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства — падтрымаў прыродаахоўнікаў і вучоных і дазволіў размясціць халадзільнік у сваім жывым кутку. У «Кажанаполісе» працуюць валанцёры.

**«Кажанаполіс» функцыянуе на базе Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства: горад Мінск, вул. Макаёнка, 8. Калі хтосьці пабачыць у зімовы час кажана, ён можа патэлефанаваць па нумары +375292139257 альбо напісаць на старонцы ў «Фэйсбуку»: facebook.com/kazhanapolis**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надзея Нікалаева. Зімовы "санаторый" для кажаноў